## Падказана сэрцам, напісана душой...

**Г**анна Атрошчанка нарадзілася ў невялічкім пасёлку Чырвоны Рог, якога ўжо няма на карце Добрушскага раёна. Некалькі гадоў маленства прайшлі ў вялікай вёсцы Пераpост, у роднай бабулі. Як прызналася сама пісьменніца, у той час на падворку бабулі, Марыі Максімаўны, была кароўка, якая лічылася карміцелькай... Таму, параіўшыся на сямейным "пасяджэнні", вырашылі так: няхай малая крыху пажыве ў Пераросце, а старэйшы сын, Васіль, застанецца разам з маці, Таццянай Маркаўнай. Прабеглі гады, вырасла свая малочная карміцелька... Таму дзяўчынцы давялося развітацца са сваімі сябрамі маленства.

Трэба адзначыць, з дзяцінства спазнала будучая пісьменніца нялёгкую сялянскую працу, шмат чаму добраму навучылася ў сваёй матулі. Таццяна Маркаўна таксама калісьці складала прыпеўкі, якія звонка спявала на вясковых вячорках. Яна добра грала на балалайцы, мандаліне, вышывала, ткала... Гэта была невысокая, прыгожая жанчынка, з выразнымі, блакітнымі вачыма, якія адлюстроўвалі добрыню і чалавечую годнасць.

Жыццё пастаянна выпрабоўвала яе на трываласць, але яна ніколі не скардзілася. Заўсёды заставалася добразычлівай, міласэрнай, працалюбівай...

У школьныя гады Ганна захаплялася валейболам, баскетболам. Удзельнічала ў лыжных спаборніцтвах, нават займела другі юнацкі разрад. Расла высокай, стройнай дзяўчынкай, сціплай, дапытлівай. Першыя вершы старанна занатоўвала ў свой вучнёўскі сшытак. Але дзіцячыя радочкі былі нязграбнымі. І, вядома ж, зусім не адпавядалі патрэбнаму ўзроўню вершаскладання.

Асаблівы ўплыў мелі заняткі ў літаратурным гуртку, які вяла настаўніца роднай мовы Дар'я Іванаўна Маёрава. Першы верш быў надрукаваны ў 1963 годзе, у газеце "Піянер Беларусі"(цяпер — "Раніца"). Шкада, гэты твор не захаваўся. На выдатна і добра вучылася будучая пісьменніца і журналістка па такіх прадметах, як руская мова і літаратура, беларуская мова і літаратура, гісторыя, батаніка, геаграфія... Настаўніцы Васільеўскай школы — Ніна Мікалаеўна Гарбачова, Праскоўя Васільеўна Фядосава, Ніна Рыгораўна Ладзюкова, Леанід Прахоравіч Засуцкі заўсёды імкнуліся даць прыстойны

багаж ведаў сваім вучням, каб яны змаглі знайсці правільны шлях у жыцці, навучыліся прыстойна фарміраваць свае думкі.

Пасля школы адбылася вучоба ў вучылішчы будаўнікоў, а затым — у тэхнікуме. У Гомелі скончыла вячэрні універсітэт, які дзейнічаў тады пры абласной газеце. Працавала на камсамольскай будоўлі ў Тальяцці, у Гомеле. Была перадавіком вытворчасці. Старанную дзяўчыну неаднаразова вылучалі ў камсоргі, прафоргі... Нават давялося папрацаваць статыстам у Цэнтральным райкоме камсамола г. Гомеля. А наперадзе была журналісцкая сцяжына ў гарадскіх газетах: "Вестник района", "Гомельскі веснік", "Советский район", шматтыражцы "Сельмашевец." Ганна Атрошчанка ад карэспандэнта "дарасла" да намесніка галоўнага рэдактара газеты, актыўна друкавалася ў розных выданнях.

Да прыкладу, у "Настаўніцкай газеце", газетах "Гомельская праўда", "Гомельские ведомости", "Беларуская ніва", "Чырвоная змена", "Народная газета", у "ЛіМе", часопісах "Вожык", "Алеся", "Маладосць", "Гоман ", калектыўных зборніках "Магістраль", "Святло шчымлівай памяці", у расійскіх ча-

сопісах "Славянские колокола" і "Междуречье" і іншых выданнях. Але ж галоўнай радасцю для пісьменніцы сталі асабістыя зборнікі паэзіі і прозы, якія выдадзены ў розныя гады.

Жыццёвага вопыту ў Ганны Мікалаеўны Атрошчанка хапае. Яна трапна змагла занатаваць у мастацкіх вобразах усё тое, што аднойчы ўбачыла, перажыла, адчула сэрцам. У яе вершах — шчырая, светлая і крышачку самотная душа паэткі-летуценніцы, якая спадзяецца, кахае, перажывае... І няспынна шукае ісціну жыцця. Цераз прызму ранімай душы праходзіць імклівае жыццё, са сваімі клопатамі, турботамі, надзеямі...

Калі чытаеш вершы Г. М. Атрошчанка, часам здаецца, што ідзеш па роднай зямлі, слухаеш спевы птушак, чуеш, як шалясціць лістота на дрэвах, як лашчыць вятрыска высокую траву ў лузе... Разам з аўтарам, адкрываеш прыгажосць у прыродзе, радуешся сонечнаму ранку, новаму дзяньку. І ў зімовым лесе бачыш, як "Бярозы пад каронай утварылі белы плед", "А ручай, сярод алешын, быццам бубен той, гудзе", "Шлейф туман саткаў густы..."

Дый ці можна застацца раўнадушным, прачытаўшы вось такія радкі:

... Стала вуліца ўжо чорнай,
Задрамаў увесь Сусвет.
Маладзік у світцы зорнай
Зіхаціць, як амулет...

Ганна Атрошчанка, як вядома мне даўно, піша для душы, а не для ганарара! Каб людзі чыталі вершы, любілі родную мову, Радзіму, каб шанавалі сваю гісторыю, культуру, свае карані. Вядома ж, паэтка не сонца — усіх не абагрэе. Але ёсць надзея, што ў чытачоў новага зборніка "Арыёза жыцця", застанецца ў душы добрае зярнятка. І калі гэтае зерне кінуць у раллю, дык абавязкова зазелянее руны!

***Тамара ВАСЮЧЭНКА,***
***бібліятэкар другой катэгорыі***
***аддзела бібліятэчнага маркетынгу***